1. **Ab ovo usque ad mala** (Гарацый). Ад яйка да яблыкаў; *ад пачатку да канца* (*у рымлян абед пачынаўся з яек, а заканчваўся яблыкамі*).
2. **Ab urbe condĭta.** Ад заснавання горада (г. зн. Рыма).
3. **Ad Kalendas Graecas.** Да грэчаскіх календаў; *на невядомы тэрмін, ніколі* (*календамі ў рымлян называўся першы дзень месяца; у грэкаў календаў не існавала*).
4. **Alea jacta est** (Юлій Цэзар). Жэрабя кінута; *выбар зроблены, рашэнне прынятае.*
5. **Alma mater.** Кормячая маці (*пра навучальную ўстанову*).
6. **Alter ego.** Іншы я; *мой двайнік, аднадумец.*
7. **Amīcus certus in re incerta cernĭtur.** Надзейны сябар пазнаецца ў рызыкоўнай справе.
8. **Amīcus Plato, sed magis amīca verĭtas** (Арыстоцель). Платон – сябар, але праўда большая сяброўка; *праўда па-над усім.*
9. **Ars longa, vita brevis** (Гіпакрат). Навука бязмежная, а жыццё кароткае.
10. **Audiātur et altĕra pars.** Варта паслухаць і супрацьлеглы бок.
11. **Aut Caesar, aut nihil.** Або Цэзар, або нішто; *усё або нічога.*
12. **Cogĭto, ergo sum** (Дэкарт). Я разважаю, такім чынам, я існую.
13. **Cognosce te ipsum.** Спазнай самога сябе.
14. **Curricŭlum vitae.** Бег жыцця; *жыццяпіс, кароткія звесткі пра жыццё, біяграфія.*
15. **Debes – ergo potes.** Павінен – значыць можаш.
16. **De gustĭbus et colorĭbus non est disputandum.** Пра густы і колеры не варта спрачацца.
17. **Dulce et decōrum est pro patria mori** (Гарацый). Прыемна і пачэсна памерці за бацькаўшчыну.
18. **Dum spiro, spero.** Пакуль дыхаю, спадзяюся.
19. **Dura lex, sed lex.** Закон суровы, але гэта закон; *закон ёсць закон.*
20. **Epistŭla non erubescit** (Цыцэрон). Папера не чырванее; *папера ўсё трывае.*
21. **Errāre humānum est.** Чалавеку ўласціва памыляцца.
22. **Est modus in rebus** (Гарацый). Ёсць мера ў рэчах; *усяму ёсць мяжа, усё мае сваю меру.*
23. **Exempli gratia (e. g.).** Напрыклад.
24. **Ex libris.** З (*чыіхсьці*) кніг.

25. **Feci, quod potui, faciant meliōra potentes.** Я зрабіў усё, што мог, хай, хто можа, зробіць лепей.
26. **Homo homĭni lupus est.** Чалавек чалавеку воўк.
27. **Homo sum et nihil humāni a me aliēnum puto** (Тэрэнцый). Я чалавек, і нішто чалавечае мне не чужое.
28. **Ignorantia non est argumentum.** Няведанне – гэта не доказ.
29. **Memento mori.** Памятай пра смерць.
30. **Mens sana in corpŏre sano** (Ювэнал). У здаровым целе – здаровы дух.
31. **Mors omnia solvit**. Смерць вырашае ўсе пытанні.
32. **Omnia mea mecum porto.** Усё сваё нашу з сабою.
33. **Per aspĕra ad astra.** Праз церні да зорак.
34. **Per fas et nefas.** Праўдамі і няпраўдамі.
35. **Plenus venter non studet libenter.** Поўны жывот не вучыцца ахвотна; *поўнае пуза да навукі глуха*.
36. **Pocŭlum, mane haustum, restaurat natūram exhaustam.** Келіх, выпіты з раніцы, аднаўляе моц.
37. **Pro et contra.** За і супраць.
38. **Quilĭbet fortūnae suae faber.** Кожны сам каваль свайго шчасця.
39. **Quod licet Jovi, non licet bovi.** Што дазволена Юпітэру, тое не дазволена быку.
40. **Quot homĭnes, tot sententiae.** Колькі людзей, столькі ж і поглядаў.
41. **Repetitio est mater studiōrum.** Паўтарэнне – маці навучання.
42. **Salus popŭli suprēma lex.** Дабрабыт народа – найвышэйшы закон.
43. **Sapienti sat.** Разумнаму досыць (*таго, што было сказана*); *разумны зразумее*.
44. **Scientia potentia est.** Веды – моц.
45. **Sic transit gloria mundi.** Так мінае зямная слава.
46. **Sine ira et studio** (Тацыт). Без гневу і прадузятасці; *аб'ектыўна*.
47. **Sit tibi terra levis.** Хай будзе табе зямля лёгкай (*прамова нябожчыкам, эпітафія*).
48. **Suum cuīque.** Кожнаму сваё.
49. **Tempŏra mutāntur et nos mutāmur in illis** (Авідзій). Часы змяняюцца і мы змяняемся разам з імі.
50. **Veni, vidi, vici** (Юлій Цэзар). Прыйшоў, убачыў, перамог.